Н43

БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

30 чэрвеня 2008 года, № 12 (1984)

ПАДЗЕЯ

## СТУДЭНЦТВУ – КАМФОРТНАЕ ЖЫЛЛЁ!

**Будаўніцтва Мінскай студэнцкай вёскі мусіць быць завершана да лістапада 2011 года. Такое даручэнне даў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 19 чэрвеня падчас цырымоніі закладзінаў гэтага моладзевага комплексу.**

На ўзвядзенне студэнцкай вёскі будзе выдаткавана каля 700 млрд руб. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэта будзе сапраўдны мінігарадок, у якім паселяцца амаль 11 тыс. студэнтаў з найбуйнейшых вышэйшых навучальных устаноў краіны.

Студэнцкая вёска будзе унікальным комплексам не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй прасторы СНД. Тут размесцяцца 8 сучасных інтэрнатаў, паліклініка, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, гандлёвы і забаўляльны цэнтры і іншыя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры.

Беларусь адносіцца да ліку краін з высокім узроўнем адукаванасці насельніцтва, а айчынныя спецыялісты канкурыруюць на міжнародным рынку працы. Таму, на думку кіраўніка дзяржавы, важна не толькі даць магчымасць вучыцца, але і стварыць камфортную атмасферу для адукацыйнага працэсу.

На ўрачыстым мерапрыемстве прысутнічалі моладзевыя дэлегацыі ад сталічных ВНУ, якія расквартуюць у комплексе сваіх навучэнцаў.

Дарэчы, першым са згаданых інтэрнатаў будзе ўзведзены студэнцкі дом для нашага універсітэта. Па словах прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміра Суворава, БДУ ў "вёсцы" займее два інтэрнаты. Адзін з іх, па ўзгадненні з гарадскімі ўладамі, мы атрымаем наўзамен састарэлай "чацверкі", што зараз на праспекце Пераможцаў. Новы будынак кватэрнага тыпу агульнай плошчай каля 20 тыс. кв. м разлічаны на 1030 месцаў. Тут прадугледжаны пакоі для спартыўных заняткаў, вучобы і адпачынку, а таксама буфет на 60 месцаў і медыцынскі блок. Здача яго "пад ключ" мяркуецца ўжо ў наступным годзе. Прыблізна тыя ж параметры і ў другога інтэрната. Ажыццяўленне гэтых планаў значна палепшыць жыллёвую сітуацыю для навучэнцаў альма-матэр, у тым ліку і замежных студэнтаў.



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка закладвае капсулу з пасланнем нашчадкам у фундамент студэнцкага комплексу.

Падрыхтаваў
Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Фота БелТА

СВЯТКАВАННІ

## АПОШНІ ЗВАНОК

**У Белдзяржуніверсітэце 20 чэрвеня прайшоў баль выпускнікоў, які сабраў каля 600 чалавек.**




Нядаўніх студэнтаў павіншавалі дэканы ўсіх факультэтаў БДУ. Рэктар прафесар Васіль Стражаў уручыў дыпломы і памятныя падарункі пераможцам конкурсу сярод найбольш паспяховых у вучобе, навуцы, грамадскай працы, культуры і спорце. У намінацыі "Найлепшы выпускнік" было ганаравана 19 чалавек, а ў намінацыі "Зорка факультэта" – 18.

Выхаванцы альма-матэр далі клятву "годна служыць прынцыпам дабра і справядлівасці на карысць чалавека, Айчызны і сусветнай цывілізацыі; захоўваць і памнажаць слаўныя традыцыі Белдзяржуніверсітэта; быць прыкладам высакароднасці, сумленнасці і працавітасці; усе намаганні, розум, памкненні накіраваць на павышэнне аўтарытэту ВНУ і з гонарам насіць званне выпускніка Беларускага дзяржаўнага універсітэта".

Затым выпускнікі перадалі сімвалічны "пуд" солі сваім малодшым таварышам. Апошні званок абвясціў пра заканчэнне ўрачыстай часткі, пасля чаго пачаўся канцэрт з удзелам творчых калектываў і выкладчыкаў БДУ, а таксама артыстаў эстрады. Свята працягнулася на свежым паветры ва ўнутраным дворыку Ліцэя БДУ.

Сёлета дыплом Белдзяржуніверсітэта атрымаюць 3,5 тыс. маладых людзей. З іх больш за 2,7 тыс. – навучэнцы дзённага аддзялення і 916 – завочнага.

Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

## ПАВЯЛІЧАНЫ ЎСЕ ВІДЫ СТЫПЕНДЫЙ НАВУЧЭНСКАЙ МОЛАДЗІ

**Паводле Указу № 338 кіраўніка дзяржавы ад 17 чэрвеня ў Беларусі з мэтай далейшага ўзмацнення сацыяльнай абароны навучэнцаў і студэнтаў павялічаны памеры ўсіх відаў дзяржаўных стыпендый.**

Так, стыпендыя для студэнтаў ВНУ складзе ад 93 тыс. руб. да 148,8 тыс. руб.; навучэнцаў установ, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, – ад 78,1 тыс. руб. да 124,8 тыс. руб.; навучэнцаў прафесійна-тэхнічных устаноў – ад 50,3 тыс. руб. да 80,4 тыс. руб.

Пераразлік стыпендый будзе праведзены з 1 красавіка 2008 г. Цікава, што студэнтам вядучых ВНУ краіны налічваецца дадатковы каэфіцыент да базавай стыпендыі. Так, у БНТУ і БДЭУ ён складзе 15 %, у БДУ – 30 %. Напрыклад, выдатнікі вучобы ў нашым універсітэце будуць атрымоўваць ад 157 тыс. руб. да 194 тыс. руб. (у іншых ВНУ – ад 121 тыс. руб. да 149 тыс. руб.). Памер імянных стыпендый у БДУ цяпер складзе 278 тыс. руб. (у іншых ВНУ – 214 тыс. руб.).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ДОБРАЯ СПРАВА

## ІЗНОЎ ЗА ПРАЦУ

**Урачыстае адкрыццё гарадскога "Трэцяга працоўнага семестра" адбылося 19 чэрвеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. На мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх сталічных ВНУ.**

Штаб працоўных спраў БРСМ БДУ летам 2008 г., як і раней, збіраецца актыўна далучыцца да арганізацыі студэнцкага руху.

З мэтаю забеспячэння планавай і скаардынаванай дзейнасці структурных падраздзяленняў і грамадскіх арганізацый нашага універсітэта па ажыццяўленні мерапрыемстваў, накіраваных на рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы занятасці студэнцкай моладзі падчас летняга перыяду, у БДУ зацверджана праграма "Працоўнае лета" на 2008–2011 гг.

Зараз фарміруюцца студэнцкія атрады на летні перыяд, працягваецца прыём заяў ад маладых людзей, якія жадаюць працаўладкавацца, студэнты праходзяць адпаведны медыцынскі агляд.

Усяго плануецца сфарміраваць 8 будаўнічых, 3 экалагічных, 2 валанцёрскіх атрады, а таксама па адным сельскагаспадарчым, педагагічным і сэрвісным атрадзе. Акрамя таго, вядзецца працаўладкаванне і ў індывідуальным парадку.

Іншагароднім удзельнікам студэнцкіх брыгад падоўжваецца пражыванне ў інтэрнаце № 6. Для іх будзе зладжана культурная і спартыўная праграма. Да таго ж, працаўнікам даецца права на першачарговае засяленне ў інтэрнаты БДУ на 2008/2009 навуч. год.

Дзмітрый ЛЕБЕДЗЬ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАЗНАЦЬ НЕ РОЗУМАМ, А СЭРЦАМ
Наш універсітэт наведаў дзяржаўны сакратар Ватыкана кардынал Тарчызіо Бертонэ.
Стар. 2

КАНКРЭТЫЗАЦЫЯ ПАРТНЁРСТВА
Прадстаўнікі БДУ бралі ўдзел у візіце беларускай дэлегацыі ў Венесуэлу.
Стар. 3

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў АСПІРАНТУРУ БДУ НА 2008 ГОД
Стар. 4

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПЕРСПЕКТЫВЫ супрацоўніцтва БДУ і Калінінградскага універсітэта абмеркавалі 18 чэрвеня ў Мінску кіраўнікі абедзвюх ВНУ Васіль Стражаў і Андрэй Клемешаў. Акрамя таго, расійскі госць наведаў хімфак і НДІ ФХП, а таксама Музей гісторыі БДУ.

РЭКТАР БДУ як старшыня Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаў СНД браў удзел у 21-м пасяджэнні гэтага савета, а таксама ў XIV Канферэнцыі міністраў адукацыі краін Садружнасці і Канферэнцыі рэктараў універсітэтаў СНД па праблемах лінгвістычнай адукацыі. Гэтыя мерапрыемствы прайшлі ў Бішкеку 7–14 чэрвеня.

ЭКСПЕРТЫ міжнароднай арганізацыі "Зальцбургскі семінар" працавалі ў БДУ 25–27 чэрвеня. Іх мэта – прааналізаваць дзейнасць нашага універсітэта па шэрагу параметраў.

ПРАРЭКТАР па вучэбнай рабоце Уладзімір Клюня 10 чэрвеня ўдзельнічаў у пасяджэнні Савета Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў і ў форуме "Універсітэты на шляху да новай якасці адукацыі", што адбыліся ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце.

XII МІЖНАРОДНАЯ асамблея рэктараў славянскіх ВНУ з 26 па 29 мая сабрала прадстаўнікоў Расіі, Беларусі, Украіны, Арменіі, Кіргізіі, Балгарыі, Польшчы, Сербіі, Чэхіі, Славакіі, Славеніі, Македоніі і інш. Мерапрыемствы адбыліся ў Маскве і Цвеpы. Наш універсітэт прадстаўляў прарэктар па вучэбнай рабоце Уладзімір Клюня.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВІЗІТЫ

Тарчызіо БЕРТОНЭ:

# “ПАЗНАЦЬ НЕ РОЗУМАМ, А СЭРЦАМ”

***Падчас свайго візіту ў нашу краіну дзяржаўны сакратар Папы Рымскага Бенедыкта XVI кардынал Тарчызіо Бертонэ 19 чэрвеня наведаў БДУ, дзе сустрэўся з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым і выступіў з лекцыяй на тэму “Вера і розум: Як гаварыць пра Бога сучаснаму чалавеку”.***



*Кардынал Тарчызіо Бертонэ ўручае памятны медаль Ватыкана рэктару БДУ прафесару Васілю Стражаву.*

Паслухаць прамову важнай духоўнай асобы прыйшлі выкладчыкі і студэнты Інстытута тэалогіі імя святых Кірылы і Мяфодзія, а таксама Гродненскай рымска-каталіцкай вышэйшай духоўнай семінарыі.

Тарчызіо Бертонэ адразу зазначыў, што пра Бога цяжка гаварыць розумам, і яго лекцыя – гэта даследаванне сэрца і розуму. Ён заўважыў, што імкненне да пазнання ісціны закладзена ў самім чалавеку. “Мы з’яўляемся часткай ісціны, якая ёсць Бог. Знайсці ісціну – значыць пазнаць самога сябе. Ведаеш ісціну – ведаеш самога сябе”, – упэўнены святар. Згодна з яго разважаннямі, вера і розум – вось два крылы, якія ўзносяць чалавечы дух да сузірання ісціны. “Кожны чалавек большы за ўсё тое, пра што можна думаць. І адкрыццё Бога ў сабе падштурхоўвае да таго, каб пашырыць межы розуму. Чалавечая думка не можа спыняцца на відавочных з’явах, яна здольна пераадолець мяжу бачнага,” – падкрэсліў кардынал.

Тарчызіо Бертонэ звярнуў увагу на тое, што багаслоўе – гэта навука, якая павінна весці дыялог з іншымі навукамі: “Нельга выкладаць рэлігію або багаслоўе фармальна, як закрытую сістэму, яе важна разумець як сістэму, якая шукае дыялог”.

Дзяржаўны сакратар Ватыкана палічыў добрай справай адкрыццё Інстытута тэалогіі імя святых Кірылы і Мяфодзія ў нашым універсітэце. На яго думку, выпускнікі гэтай навучальнай установы ў будучыні змогуць дапамагаць у прыходах на пастарскім узроўні або выкладаць рэлігію ў школах і універсітэтах.

Трэба сказаць, што Рымска-каталіцкая царква з’яўляецца другой па колькасці вернікаў канфесіяй у Беларусі. У краіне налічваецца 463 прыходы, якія аб’яднаны ў 4 епархіі, дзейнічае 9 рымска-каталіцкіх місій і 8 манастыроў. Маецца 450 касцёлаў, яшчэ 37 знаходзяцца на стадыі будаўніцтва. У царкоўных прыходах працуюць 398 святароў, з якіх 180 – замежныя грамадзяне, пераважна з Польшчы. Адной з праблем Рымска-каталіцкай царквы з’яўляецца значны недахоп пастараў з ліку беларусаў. Аднак апошнім часам вядзецца іх актыўная падрыхтоўка ў духоўных навучальных установах як у нашай краіне, так і за яе межамі, што дазволіць вырашыць гэту праблему праз 7 гадоў.

**Ганна ЛАГУН**

**Фота Аляксандра СНАПКА**

НАША СПАДЧЫНА

***29 чэрвеня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце адзначаны Дзень памяці студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.***

# УСПОМНІЦЬ УСЁ...

Нагадаем, што гэта памятная дата звязана з падзеямі 67-гадовай даўніны. Менавіта 29 чэрвеня 1941 года планавалася ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета з нагоды 20-годдзя БДУ. Але правядзенню юбілейнага мерапрыемства перашкодзіла вайна.

Усе імёны прадстаўнікоў універсітэта, што аддалі ўласныя жыцці за свабоду свайго народа, выбіты на стэле, якая ўсталявана ва універсітэцкім дворыку. Да гэтага помніка былі ўскладзены кветкі як даніна павагі да тых, хто пайшоў у бесмяротнасць.

Памятаць пра подзвігі папярэднікаў – гэта бясспрэчны абавязак нашчадкаў і ці не самы моцны імпульс у выхаванні патрыятызму. Такой мэтай кіраваліся і арганізатары віктарыны, прысвечанай падзеям вайны, сярод студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў універсітэта. Яе пераможцы атрымалі прызы асабіста ад рэктара прафесара Васіля Стражава: гэта Марына Кадол (IV курс ФМА) і Артур Дзянісаў (II курс ФФСН) за 1-е месца, Стэфаніда Басавец (аспірантка ФМА) за 2-е месца і Алена Сілкіна (аспірантка геафака) за 3-е месца. Журы ўлічвала не толькі правільнасць і дакладнасць адказаў, але і творчы падыход да ўдзелу ў віктарыне, афармленне сваіх прац. Кожнаму з пераможцаў былі ўручаны і грашовыя прэміі: 350 тыс. руб., 250 тыс.руб і 150 тыс.руб. адпаведна занятым месцам.

**Надзея КУХАРЧЫК**



ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Матэрыял пра сустрэчу дэкана факультэта журналістыкі Сяргея Дубовіка з Першым сакратаром па справах адукацыі пасольства КНР у нашай краіне Бэй Вэнлі, гутарку з начальнікам участка садова-паркавай гаспадаркі БДУ Ірынай Данілевіч, нарыс пра публіцыстыку часоў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама шмат іншых цікавых публікацый чытайце на сайце нашага выдання**

www.gazeta.bsu.by

ЗНАЁМЦЕСЯ

# ПРАСУНУТАЯ СТАТЫСТЫКА АЎСТРЫЙСКАГА ПРАФЕСАРА

***Наш універсітэт задзейнічаны ў шматлікіх праграмах міжнароднага абмену ведамі. Тут нярэдка можна сустрэць замежных выкладчыкаў, якія далучаюць студэнтаў да дасягненняў сусветнай навукі і да таго ж спрыяюць адаптаванню маладзёнаў да жыцця ў полікультурным грамадстве. Адна з такіх асоб – прафесар Петэр Фільцмоўзер з Венскага універсітэта тэхналогій, які выкладаў на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Мы пацікавіліся яго ўражаннямі, а таксама пагутарылі пра адметнасці беларускай і аўстрыйскай адукацыйных сістэм, поспехі нашых студэнтаў і ролю статыстыкі ў кіраванні грамадскай думкай.***



**– Спадар Петэр, як Вы патрапілі ў Беларусь?**

– У Аўстрыі існуе праграма “MOEL” (ад Аўстрыйскай асацыяцыі даследаванняў), якая дае стыпендыі навукоўцам, калі яны накіроўваюцца ў Сярэднюю, Усходнюю і Паўднёвую Еўропу для даследаванняў і выкладання. Я атрымаў такую стыпендыю, каб патрапіць у БДУ. Займаюся статыстыкай, ужо некалькі гадоў супрацоўнічаю з калегамі з вашага універсітэта, і мая праца тут умацавала гэтае супрацоўніцтва.

**– Ці вялікая розніца паміж аўстрыйскай і беларускай адукацыйнымі сістэмамі?**

– Паколькі я тут нядаўна, то не надта добра ведаю вашу сістэму. Заўважыў толькі, што ў вас існуе сетка заняткаў, чаго няма ў нас. У Аўстрыі складаецца праграма навучання, якая ўключае некалькі абавязковых курсаў, а яшчэ студэнты вольныя выбіраць з шэрагу іншых прапанаваных лекцый. Яны проста наведваюць іх і калі гатовыя – здаюць іспыты.

**– А наведванне гэтых лекцый правяраецца?**

– Звычайна не. Студэнтаў не прымушаюць прыходзіць на лекцыі, але прысутнасць дазваляе атрымаць пэўныя практычныя навыкі, што набываюцца падчас выканання практыкаванняў. Калі курс лекцый заканчваецца, студэнтаў зноў жа не гоняць на іспыты пад прымусам. Звычайна ў семестры прадугледжана тры магчымасці здаць экзамен, і студэнты робяць гэта тады, калі ім найболей зручна, што насамрэч не заўжды добра, бо калі-нікалі яны прыходзяць праз доўгі тэрмін пасля таго, як праслухалі курс.

**– Аўстрыйскія студэнты, напэўна, вельмі адказна ставяцца да сваёй адукацыі...**

– Гэта і было ідэяй нашай сістэмы – зрабіць студэнтаў больш самастойнымі і адказнымі, але, бачыце, сістэма не заўсёды працуе належным чынам.

**– Што за курс Вы чыталі ў БДУ?**

– Гэта быў курс па спецыялізаванай тэме ў статыстыцы, які называўся “Прасунутая рэгрэсія і класіфікацыя” (“Advanced Regression & Classification”). Падзелены на тэарэтычную і практычную часткі, ён мусіў навучыць студэнтаў прымяняць пэўныя тэарэтычныя канцэпты да рэальных блокаў даных з дапамогаю кампутара. На занятках мы карысталіся праграмай “R”. Яе вялікая перавага ў тым, што ў той час, як большасць кампутарных праграм вельмі дарагія, гэтая – бясплатная і прытым вельмі добрая, прызнаная ва ўсім свеце. Студэнты паўсюль могуць лёгка “спампаваць” яе. Думаю, маім студэнтам яна вельмі спадабалася. Напачатку я займаўся з 20-цю студэнтамі, але быў, верагодна, занадта патрабавальны да іх, так што напрыканцы толькі 13 здалі экзамен.

**– Вы можаце нейкім чынам параўнаць аўстрыйскіх і беларускіх студэнтаў?**

– Моўны бар’ер робіць такое параўнанне складаным, але маю ўражанне, што беларускія студэнты не такія самаўпэўненыя, як нашы. Да прыкладу, калі падаецца, што я раблю якіясьці дробныя памылкі падчас лекцыі, аўстрыйцы адразу ж усчыняюць гвалт і перапытваюць – нават калі памыляюцца яны, а не я. Такая самаўпэўненасць не заўсёды перавага, але аддача, жывая рэакцыя на пачутае цэніцца.

**– Дзе Вы жылі падчас выкладання ў БДУ?**

– У студэнцкім інтэрнаце па вул. Свярдлова разам з жонкай, трыма дзеткамі і цёшчай. Там было хораша і камфортна, даволі многа прасторы. Па праўдзе, я ўдзячны тым людзям, якія дапамаглі нам уладкавацца ў БДУ – найперш рэктару, які вельмі ўважліва паставіўся да нас, затым начальніку ўпраўлення міжнародных сувязяў Уладзіміру Ціханаву і, канешне, маім тутэйшым калегам, прафесару Юрыю Харыну.

**– Давайце яшчэ раз звернемся да праблемы “моўнага бар’еру”. На якой мове Вы вялі заняткі?**

– Выкладаў па-англійску і пабачыў падчас іспытаў, што студэнты гэтай мовай валодаюць добра, у іх, відавочна, не было праблем з разуменнем. Іншая сітуацыя з астатнімі студэнтамі: тыя, хто завітваў у аўдыторыю, дзе я працаваў, у пошуках нейкіх людзей, пачыналі гаварыць па-руску. Калі я прасіў іх паўтарыць тое самае па-англійску, яны вокамгненна знікалі. Мяркую, яны не прывыклі да маўлення па-англійску? Але ж іх трэба прывучаць, бо гаварыць на замежных мовах вельмі важна. У Венскім універсітэце тэхналогій некаторыя курсы на англійскай мове зроблены абавязковымі для вывучэння.

**– Ці не маглі б Вы падзяліцца асноўнай ідэяй той тэорыі, якую прапанавалі нашым студэнтам?**

– Я намагаўся даць ім тэарэтычную базу для больш прасунутых метадаў апрацоўкі велізарных аб’ёмаў інфармацыі. Сёння ў кожнай сферы накапілася процьма інфармацыі, і калі хочаш у ёй штосьці знайсці, давядзецца выкарыстаць хуткія і мудрагелістыя статыстычныя метады. Возьмем прыклад з медыцыны – калі трэба адрозніць здаровых людзей ад хворых, выкарыстоўваючы даныя па генетычнай інфармацыі асоб, спатрэбяцца статыстычныя метады, якія дазволяць апрацаваць вялікую колькасць даных і класіфікаваць абедзве групы.

**– З якімі цяжкасцямі Вы сутыкнуліся тут?**

– Інтэрнэт аказаўся жахліва марудны – гэта сапраўды добра было б выправіць, што дапаможа навуковай працы і міжнароднаму абмену ведамі. Я пішу кнігу і таму рэгулярна маю патрэбу абменьвацца файламі (у межах 2–3 Мб) са сваімі аўстрыйскімі калегамі, але ўдзень перадаць гэтыя файлы было проста немагчыма.

**– У СМІ існуе стэрэатып, паводле якога статыстыка выступае сродкам маніпуляцыі грамадскай думкі. Многія выказваюць занепакоенасць, што любыя лічбы можна па-рознаму інтэрпрэтаваць. Што Вы думаеце на гэты конт?**

– Вы кажаце пра самую простую, базавую статыстыку. Тое, чым мы займаемся тут, вельмі далёка ад гістаграм і лічбавых выкладак, якія можна знайсці ў СМІ. Але, канечне, заўсёды трэба быць асцярожным з інтэрпрэтацыяй статыстычных вынікаў, нават калі гаворка ідзе пра вельмі прасунутыя метады. Вось чаму я заўсёды лічыў істотным даваць студэнтам практыкаванні з рэальнымі прыкладамі, дзе яны змаглі б пабачыць вынікі і правільна іх патлумачыць.

**– Дазвольце пацікавіцца Вашымі ўражаннямі ад краіны. Ці пабачылі Вы слынныя мясціны Беларусі?**

– Мы з сям’ёй даволі многа вандравалі па Беларусі, наведалі Гомель, Гродна, Браслаў, Полацк і іншыя гарады. Агульнае ўражанне: Беларусь – гэта сапраўды вельмі прыгожая краіна. Беларускія людзі спакойныя і прыязныя, на вуліцах бяспека, што насамрэч – рэдкасць для вялікіх гарадоў. Нам вельмі спадабаліся праведзеныя тут тры месяцы.

**– Што збіраецеся рабіць пасля вяртання ў Аўстрыю?**

– Вярнуся да свайго звычайнага жыцця: выкладанне, даследаванні. Спадзяюся на больш інтэнсіўнае супрацоўніцтва з Беларуссю, не толькі з калегамі, але і са студэнтамі. Двое з маёй групы выказалі цікаўнасць да такога далейшага супрацоўніцтва, і я пастараюся ўключыць іх нейкім чынам у свае даследчыя праекты. Мая мэта, аднак, не ў тым, каб забіраць вашых найлепшых студэнтаў у Аўстрыю, а хутчэй ва ўмацаванні абмену ведамі паміж нашымі краінамі.

**Гутарыла Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# КАНКРЭТЫЗАЦЫЯ ПАРТНЁРСТВА



*На пасяджэнні Беларуска-Венесуэльскай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій (5 чэрвеня 2008 г., г. Каракас).*

***Беларуска-венесуэльскія адносіны развіваюцца даволі імкліва. Распачаў іх афіцыйны прыезд у Мінск паўднёваамерыканскага лідара Уга Чавеса ў ліпені мінулага года, пасля чаго адбылося шмат важных падзей. Гэта і візіт у адказ кіраўніка нашай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў Балівaрыянскую Рэспубліку, прымеркаваны да адкрыцця Нацыянальнай выставы Беларусі ў Каракасе; і падпісанне шэрагу міжурадавых пагадненняў і дамоваў у сферы адукацыі; і першае пасяджэнне Беларуска-Венесуэльскай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій. А сёлета, 1 чэрвеня, прадстаўнічая беларуская дэлегацыя наведала сталіцу Венесуэлы для правядзення другога мерапрыемства такога кшталту.***

У склад нашага "дэсанту" на чале са старшынёй ДКНТ Уладзімірам Мацюшковым уваходзіла 14 чалавек ад НАН РБ, БДУ, БДУІР, БНТУ, НВА "Белмікрасістэмы" і НТЦ "Геаінфармацыйныя сістэмы".

У першыя тры дні айчынныя спецыялісты наведалі з рабочымі візітамі Інстытут перспектыўных навуковых даследаванняў (IDEA), Інстытут фундаментальных інжынерных даследаванняў (FII), Венесуэльскі інстытут навуковых даследаванняў (IVIC), а таксама біяфармацэўтычнае прадпрыемства "Quimbiotec", дзе былі абмеркаваны вылучаныя ў выніку папярэдніх сустрэч навуковыя праекты і новыя напрамкі сумесных даследаванняў.

5 і 6 чэрвеня адбылося само пасяджэнне двухбаковай камісіі, на якім была праведзена рэвізія кожнага з прапанаваных сумесных праектаў і вызначаны іх цяперашні стан. Акрамя таго, закраналіся такія агульныя пытанні, як скасаванне двайнога падаткаабкладання, працэдуры адбору і фінансавання праектаў з сумеснага беларуска-венесуэльскага інвестыцыйнага фонду і інш.

У выніку з разгледжаных 17-ці прапаноў беларускага боку 13 былі зацверджаны паўднёваамерыканскімі партнёрамі ў якасці прыярытэтных праектаў (10 з іх распрацаваны ў НАН РБ, 2 – у БДУ і яшчэ адзін – у БДУІРы). На іх рэалізацыю Міністэрства фінансаў Венесуэлы гатова выдаткаваць каля 300 млн долараў ЗША.

Белдзяржуніверсітэт прадстаўлялі дэкан механіка-матэматычнага факультэта прафесар Міхаіл Жураўкоў і вядучы навуковы супрацоўнік НДІ ядзерных праблем Віктар Карповіч. Як заўважыў намеснік прарэктара па эканоміцы і інвестыцыях Уладзімір Панарадаў, у нашай ВНУ рэалізуецца паступовая стратэгія ўдзелу ў супрацоўніцтве. Па сумеснаму праекту прафесара М. Жураўкова з навукоўцамі дэпартамента інфармацыйных тэхналогій FII "Прымяненне сучасных InSAR-тэхналогій для аналізу ссоўвання зямной паверхні на ўсходнім узбярэжжы возера Маракабо (Венесуэла)" цалкам вырашаны ўсе тэхнічныя пытанні і падрыхтаваны адпаведны кантракт. В. Карповіч правёў перамовы з кіраўніцтвам IVIC і Цэнтра біятэхналогій IDEA наконт прапанаванага сумеснага праекта "Фактары, якія ўплываюць на ўраджайнасць рысу", падчас чаго была дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы матэрыялаў для ўключэння праекта ў Выканаўчую праграму навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Па словах У. Панарадава, да наступнага пасяджэння камісіі магчыма заяўленне яшчэ аднаго праекта ад БДУ.

У заключэнне 6 чэрвеня ўдзельнікі беларускай дэлегацыі былі запрошаны на адкрыццё Венесуэльскага аддзялення Цэнтра Венесуэльска-Беларускага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, створанага на базе Нацыянальнага эксперыментальнага універсітэта імя Сімона Радрыгеса.

**Падрыхтаваў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

АБ'ЯВА

## ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ!

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні **на другое паўгоддзе 2008 года.**

Навукова-тэарэтычны часопіс **"Сацыялогія"** – першае ў Рэспубліцы Беларусь перыядычнае выданне па пытаннях сацыялогіі. У ліку аўтараў часопіса – вядучыя сацыёлагі Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краін СНД, а таксама ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Польшчы і інш.

Часопіс уключаны Прэзідыумам ВАК Рэспублікі Беларусь у Пералік выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Часопіс разлічаны на чытачоў, якія спецыялізуюцца ў галіне сацыялогіі, а таксама сумежных галін навукі: выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў-практыкаў.

Перыядычнасць выхаду часопіса – 1 раз у квартал.

Кошт падпіскі на навукова-тэарэтычны часопіс "Сацыялогія" ў 2-м паўгоддзі складае:

- для індывідуальных падпісчыкаў – **30 480** руб. (кошт 1-га нумара – **15 240** руб.); індэкс – **74932;**
- для ведамаснай падпіскі – **71 176** руб. (кошт 1-га нумара – **35 588** руб.); індэкс – **749322.**

Падпісацца на часопіс "Сацыялогія" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі РУП "Белпошта" Рэспублікі Беларусь (Каталог выданняў Рэспублікі Беларусь на 2-е паўгоддзе 2008 года).

**Рэдакцыя часопіса**

КАНФЕРЭНЦЫІ

# ІНФАРМАВАННЕ І ПАДСУМАВАННЕ

***Першая Міжнародная канферэнцыя "Беларусь і Кітай: гісторыя, традыцыі, досвед, перспектывы" прайшла 25 чэрвеня ў Белдзяржуніверсітэце.***

Яе арганізатары – Міністэрства адукацыі нашай краіны, Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ і пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі.

Мэта правядзення форуму – даць аб'ектыўную інфармацыю пра стан эканомікі, культуры і грамадства КНР, а таксама прааналізаваць увесь 15-гадовы шлях беларуска-кітайскіх адносін.

Удзел у канферэнцыі бралі прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, Міністэрства замежных спраў і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, банкаўскіх структур, шэрагу вышэйшых навучальных устаноў нашай рэспублікі, а таксама Маскоўскага дзяржаўнага, Санкт-Пецярбургскага, Хельсінскага, Гамбургскага і Сафійскага універсітэтаў.

На пленарным пасяджэнні ў "чырвоным доме" гасцей віталі рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, начальнік упраўлення краін Азіі і Афрыкі МЗС Беларусі Аляксандр Ульянчанка, Першы сакратар пасольства КНР у нашай краіне Бэй Вэнлі, а таксама віцэ-старшыня НАН РБ Аляксандр Цыганоў і акадэмік Пётр Нікіценка.

Тады ж адбылася ўрачыстая перадача дзвюм сталічным гімназіям і МДЛУ вучэбнай літаратуры і мультымедыйнай энцыклапедыі з 16-ці DVD-дыскаў па культуры, гісторыі, геаграфіі Кітая. Гэтыя падарункі падрыхтаваны Рэспубліканскім інстытутам імя Канфуцыя БДУ і пасольствам КНР у нашай краіне.

Акрамя таго, былі ўручаны дыпломы 16-ці выпускнікам з ліку кітайскіх грамадзян магістратуры эканамічнага факультэта БДУ. Дарэчы, на эканамфаку навучаецца найбольшая колькасць кітайскіх студэнтаў (каля 80-ці чалавек) у межах нашай ВНУ.

Праца канферэнцыі працягнулася затым на 3-х секцыях: "Кітайская цывілізацыя і яе роля ў сучасных працэсах глабалізацыі і міжнародных адносінах"; "Кітайская мадэль мадэрнізацыі і глабалізацыі эканомікі", "Гісторыя, культура, адукацыя".

Напрыканцы ў Зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ былі падведзены вынікі.

**Настасся ЮДЧЫЦ**

ВЫСТАВЫ

# БДУэкспа

***Беларускі дзяржаўны універсітэт удзельнічаў у III Міжнароднай спецыялізаванай выставе "Чалавек і бяспека", якая прайшла 11–13 ліпеня ў НВЦ "Белэкспа".***

На выставе дэманстраваліся сродкі аховы жыцця і здароўя людзей, навакольнага асяроддзя, а таксама шырокі спектр распрацовак для службаў бяспекі.

З экспазіцыяй універсітэта пазнаёміўся старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Мікалай Чаргінец, які звярнуў увагу на аўтаматызаваную сістэму кіравання гарадскім дарожным рухам, а таксама зацікавіўся працай і перспектыўнымі планамі Цэнтра аэракасмічнай адукацыі.

Сёлета БДУ браў удзел у 9-ці міжнародных, нацыянальных і спецыялізаваных выставах, якія праходзілі ў Расіі, Германіі, Азербайджане і нашай рэспубліцы. 17 распрацовак адзначаны медалямі і дыпломамі.

**Ларыса КАСАРЫНА,**
**загадчык сектара**
**выставачнай дзейнасці УІД**

ВЫТВОРЧАСЦЬ

# З ПАЧЫНАМ!

***Савет дырэктараў унітарных прадпрыемстваў комплексу БДУ створаны 24 чэрвеня згодна з адпаведным рашэннем Вучонага савета нашага універсітэта.***

Узначаліў новую грамадскую структуру кіраўнік УП "Шчомысліца" Сяргей Чайкун. Гэтую кандыдатуру адзінагалосна падтрымалі прадстаўнікі дырэктарскага корпуса БДУ, якія ці не ўпершыню сабраліся разам у зале Вучонага савета фізічнага факультэта. У гэтай сустрэчы таксама браў удзел прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях Уладзімір Спірын.

Як мяркуецца, савет будзе садзейнічаць больш цеснаму і эфектыўнаму супрацоўніцтву паміж прадпрыемствамі і БДУ, у тым ліку актыўнаму ўдзелу прадпрыемстваў у інавацыйнай дзейнасці нашай ВНУ. Увогуле, як паказала сустрэча, жывы абмен інфармацыяй і назапашаным вопытам – карысная справа для ўсіх бакоў. Акрамя таго, на думку кіраўнікоў прадпрыемстваў, такі савет можа стаць своеасаблівым аналагам прафсаюза дырэктараў.



*Кіраўнік новай структуры Сяргей Чайкун (другі злева ў першым радзе) разам з калегамі і прадстаўнікамі адміністрацыі БДУ.*

У бліжэйшы час мяркуецца прыняць Статут новай структуры, у якім будуць прапісаны правы і паўнамоцтвы гэтай грамадскай арганізацыі.

Наступнае пасяджэнне Савета дырэктараў унітарных прадпрыемстваў комплексу БДУ адбудзецца на базе УП "Шчомысліца".

**Вольга НОВІКАВА**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Выкладчык Ліцэя БДУ Аляксандр Набібулін прызнаны найлепшым замежным удзельнікам Усерасійскай інтэрнэт-алімпіяды "Нанатэхналогіі – прарыў у будучыню"** – "Настаўніцкая газета" ("Чым вабяць нанатэхналогіі маладых вучоных?", 24.06).

**Вынікі віктарыны "Універсітэтазнаўства"** – "Народная газета" ("Папараць-кветку шукайце на родных палетках" і "Збяры ў адну ўсю Беларусь сям'ю...", 21.06).

**Выпускны баль у БДУ** – "Звязда" ("Зарапад" на выпускным балі", 20.06); БелТА (16.06); БелаПАН (20.06); "Вечерний Минск" (17.06).

**Лекцыя ў БДУ Дзяржаўнага сакратара Яго Святасці Бенедыкта XVI кардынала Тарчызіо Бэртонэ** – "Звязда" ("Вера і розум як спадарожнікі ў дарозе", 20.06); БелТА (20.06, 18.06); БелаПАН (19.06, 18.06); naviny.by (19.06, 18.06); telegraf.by (19.06); tut.by (18.06).

**Аб праектах пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ расказвае спецыяліст Таццяна Касцюкевіч** – "Звязда" (20.06).

**Міжнародная канферэнцыя "Беларусь і Кітай: гісторыя, традыцыі, досвед, перспектывы"** – БелТА (20.06).

**Як праходзіла цэнтралізаванае тэсціраванне ў БДУ** – "Рэспубліка" ("На полчаса больше", 20.06; "Протестируемся?!", 12.06); "Звязда" ("Тэсціраванне пачалося!", 13.06).

**Пачатак астранамічнага лета, каментар спецыялістаў абсерваторыі БДУ** – БелТА, tut.by (19.06).

**Інтэрв'ю з загадчыкам кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі механіка-матэматычнага факультэта БДУ Валерыям Еравенка** – "Настаўніцкая газета" ("Захапляюся геніяльным Моцартам, але люблю працаўніка Сальеры", 17.06).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АФІЦЫЙНА

# БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ НА 2008 ГОД

### З адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

**Механіка-матэматычны факультэт:** матэматычны аналіз; дыферэнцыяльныя ўраўненні; геаметрыя і тапалогія; матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў; вылічальная матэматыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; механіка дэфармаванага цвёрдага цела; механіка вадкасці, газу і плазмы.

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:** дыферэнцыяльныя ўраўненні; тэорыя імавернасці і матэматычная статыстыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; тэарэтычныя асновы інфарматыкі; матэматычнае мадэляванне, лікавыя метады і комплексы праграм; метады і сістэмы абароны інфармацыі; вылічальная матэматыка.

**Фізічны факультэт:** тэарэтычная фізіка; оптыка; фізіка кандэнсаванага стану; фізіка паўправаднікоў; лазерная фізіка; біяфізіка; аптычныя і оптаэлектронныя прылады і комплексы; фізіка атамнага ядра і элементарных часціц.

**Факультэт радыёфізікі і электронікі:** прылады і метады эксперыментальнай фізікі; фізічная электроніка; фізіка плазмы; інфармацыйна-вымяральныя і кіруючыя сістэмы; сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі; элементы і прылады ВТ і сістэм кіравання; цвёрдацельная электроніка, радыёэлектронныя кампаненты, мікра- і нанаэлектроніка на квантавых эфектах; радыёфізіка.

**Хімічны факультэт:** аналітычная хімія; арганічная хімія; хімія цвёрдага цела; неарганічная хімія; фізічная хімія; высокамалекулярныя злучэнні.

**Біялагічны факультэт:** біяхімія; мікрабіялогія; заалогія; фізіялогія і біяхімія раслін; фізіялогія; гідрабіялогія; біятэхналогія.

**Гістарычны факультэт:** айчынная гісторыя; усеагульная гісторыя; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання; археалогія; этнаграфія, этналогія і антрапалогія; музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў.

**Факультэт міжнародных адносін:** гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права, еўрапейскае права; палітычныя інстытуты і працэсы, палітычная канфлікталогія, палітычныя тэхналогіі; тэорыя і гісторыя культуры.

**Эканамічны факультэт:** эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук:** анталогія і тэорыя пазнання; гісторыя філасофіі; сацыяльная філасофія; рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія, філасофія культуры*; агульная псіхалогія, псіхалогія асобы, гісторыя псіхалогіі; сацыяльная псіхалогія; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі; сацыялогія кіравання; сацыяльная структура, сацыяльныя інстытуты і працэсы*.

**Філалагічны факультэт:** беларуская літаратура*; тэорыя мовы; славянскія мовы*; беларуская мова; руская мова*; літаратура народаў краін замежжа (нямецкая літаратура).

**Факультэт журналістыкі:** журналістыка.

**Юрыдычны факультэт:** тэорыя і гісторыя права і дзяржавы, гісторыя прававых вучэнняў; працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза, аператыўна-вышуковая дзейнасць; судовая ўлада, пракурорскі нагляд, арганізацыя праваахоўнай дзейнасці, адвакатура*; адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права; тэорыя палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі; палітычныя інстытуты і працэсы, палітычная канфлікталогія, палітычныя тэхналогіі; палітычныя праблемы міжнародных адносін і глабальнага развіцця; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; грамадзянскі працэс, арбітражны працэс; канстытуцыйнае права, муніцыпальнае права.

**Геаграфічны факультэт:** агульная і рэгіянальная геалогія; фізічная геаграфія і біягеаграфія, геаграфія глебаў і геахімія ландшафтаў; эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія; геаэкалогія; картаграфія.

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі:** агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі)*; тэорыя і методыка прафесійнай адукацыі.

**Кафедра фізвыхавання і спорту:** тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры.

### Без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

**Механіка-матэматычны факультэт:** дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка*.

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:** тэарэтычныя асновы інфарматыкі; метады і сістэмы аховы інфармацыі, інфармацыйная бяспека; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў і камп'ютарных сетак.

**Фізічны факультэт:** прылады і метады для вымярэння іанізуючых выпраменьванняў і рэнтгенаўскія прылады.

**Факультэт радыёфізікі і электронікі:** сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі; прылады і метады эксперыментальнай фізікі.

**Біялагічны факультэт:** фізіялогія і біяхімія раслін*; біятэхналогія.

**Гістарычны факультэт:** усеагульная гісторыя (адпаведнага перыяду); этнаграфія, этналогія і антрапалогія*; музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў.

**Факультэт міжнародных адносін:** гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права, еўрапейскае права; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; палітычныя інстытуты, этнапалітычная канфлікталогія, нацыянальныя і палітычныя працэсы і тэхналогіі; тэорыя і гісторыя культуры.

**Эканамічны факультэт:** эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай.

**Філалагічны факультэт:** беларуская літаратура; фалькларыстыка*; тэорыя мовы*.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук:** медыцынская псіхалогія*; сацыяльная псіхалогія; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі.

**Факультэт журналістыкі:** журналістыка.

**Юрыдычны факультэт:** адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права; тэорыя і гісторыя права і дзяржавы, гісторыя прававых вучэнняў; канстытуцыйнае права, муніцыпальнае права; крымінальнае права і крыміналогія, крымінальна-выканаўчае права; судовая ўлада, пракурорскі нагляд, арганізацыя праваахоўчай дзейнасці, адвакатура*; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза, аператыўна-вышуковая дзейнасць*.



**Геаграфічны факультэт:** фізічная геаграфія і біягеаграфія, геаграфія глебаў і геахімія ландшафтаў; эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія.

**Кафедра фізвыхавання і спорту:** тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры.

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі:** тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах).

* – толькі мэтавыя месцы.

## Правілы прыёму

**Навучанне вядзецца на аснове дзяржзаказу** па заяўках арганізацый, якія маюць патрэбу ў кадрах вышэйшай кваліфікацыі. Аспірант, заказчык (арганізацыя, якая падала заяўку) і выканаўца (БДУ) заключаюць кантракт, дзе вызначаюцца абавязкі бакоў. Кантракты заключаюць аспіранты ўсіх формаў навучання.

У аспірантуру з адрывам і без адрыву ад вытворчасці прымаюцца асобы, якія маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі (за выключэннем дыплома бакалаўра) і (ці) дыплом магістра, схільнасць да навуковых даследаванняў, што пацвярджаецца навуковымі публікацыямі, удзелам у навукова-даследчых і інавацыйных праектах, навукова-практычных канферэнцыях, семінарах і іншымі матэрыяламі. Тыя, хто паступае, павінны мець вопыт практычнай работы не менш за два гады альбо рэкамендацыю Вучонага савета факультэта ВНУ.

У аспірантуру па спецыяльнасцях педагагічнай галіны прымаюцца асобы, якія маюць стаж работы па спецыяльнасці ў сферы адукацыі не менш за 2 гады.

Асобы, якія раней прайшлі аспіранцкую падрыхтоўку ў межах вызначанага тэрміну ці поўны курс знаходжання ў якасці суіскальніка вучонай ступені, не маюць права паўторнага навучання ў аспірантуры за кошт бюджэтных сродкаў.

Тыя, хто паступае ў аспірантуру, здаюць уступныя экзамены па спецыяльнасці, замежнай мове і філасофіі ў аб'ёме дзеючых праграм для вышэйшых навучальных устаноў. З праграмамі можна азнаёміцца на адпаведных кафедрах. Уступны экзамен па спецыяльнасці папярэднічае экзаменам па іншых дысцыплінах. Пераздача ўступных экзаменаў не дапускаецца.

Ацэнка ведаў тых, хто паступае, ажыццяўляецца па дзесяцібальнай шкале.

Асобы, якія здалі цалкам ці часткова кандыдацкія экзамены згодна з вызначанымі патрабаваннямі, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца пераважным правам залічэння ў аспірантуру па конкурсе. **Здача ўступнага экзамену па спецыяльнасці пры прыёме ў аспірантуру абавязковая.**

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць на імя рэктара універсітэта **заяву вызначанага ўзору** і дадаюць **наступныя дакументы:**

- асабісты лісток па ўліку кадраў з наклееным фотаздымкам;
- аўтабіяграфію;
- медыцынскую даведку па форме, вызначанай Міністэрствам аховы здароўя для тых, хто паступае ў ВНУ;
- ксеракопіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіскі з заліковай ведамасці;
- пасведчанне аб здачы кандыдацкіх экзаменаў і заліку (пры наяўнасці ў тых, хто паступае ў аспірантуру, здадзеных кандыдацкіх экзаменаў);
- ксеракопію працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе);
- ксеракопію пашпарта (стар.1, 31, 32, 33 і старонка з прапіскай);
- рэкамендацыю Савета факультэта ВНУ. Рэкамендацыя выдаецца ў год выпуску і дзейнічае на працягу 2-х гадоў. У рэкамендацыі Вучонага савета факультэта ВНУ павінна ўказвацца тэма дыпломнай работы ці магістэрскай дысертацыі, а таксама адлюстроўвацца ўдзел рэкамендаванага ў навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, наяўнасць у яго публікацый (артыкулаў, дакладаў), патэнтаў на вынаходніцтвы, грантаў, імянных стыпендый;
- спіс і копіі апублікаваных навуковых прац, вынаходніцтваў і распрацовак, патэнтаў і спіс справаздач аб выкананых даследаваннях і распрацоўках; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых прац, вынаходніцтваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па абранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. Навуковыя працы ці рэферат рэцэнзуюцца меркаваным навуковым кіраўніком. Рэцэнзія пішацца на адваротным баку экзаменацыйнага ліста. Паводле рэферата выстаўляецца ацэнка па дзесяцібальнай сістэме;
- пратакол вынікаў сумоўя;
- 1 фотаздымак;
- два канверты са зваротным адрасам;
- хуткасшывальнік (кардонны, аднатонны).

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру па накіраваннях арганізацый, прадстаўляюць дадаткова накіраванні арганізацый.

Пашпарт, арыгіналы дыплома аб заканчэнні ВНУ і дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

**Прыём у аспірантуру з 1 ліпеня па 15 верасня 2008 года.**

Уступныя экзамены праводзяцца з 25 верасня па 18 кастрычніка 2008 г.

**Залічэнне ў аспірантуру з 1 лістапада.**

Усім, хто паступае ў аспірантуру, перад першым уступным экзаменам па спецыяльнасці неабходна забраць у аддзеле аспірантуры экзаменацыйны ліст з пратаколам і пасля экзамену ў гэты ж дзень вярнуць іх у аддзел аспірантуры.

На наступныя экзамены (па замежнай мове і філасофіі) экзаменацыйныя лісты будуць накіроўвацца цэнтралізавана.

Усе, хто паступае ў аспірантуру, да 10 верасня павінны прайсці сумоўе з загадчыкамі кафедраў і меркаванымі навуковымі кіраўнікамі.

Асобам, дапушчаным да здачы ўступных экзаменаў у аспірантуру, паводле іх заявы наймальнік абавязаны даць адпачынак без захавання заработнай платы для падрыхтоўкі і здачы ўступных экзаменаў.

Паводле вынікаў уступных экзаменаў прыёмная камісія прымае рашэнне аб залічэнні ў аспірантуру асоб, якія паспяхова іх здалі.

Пры аднолькавай суме балаў па выніках здачы ўступных экзаменаў пераважным правам залічэння ў аспірантуру карыстаюцца асобы, якія атрымалі больш высокую адзнаку па спецыяльнай дысцыпліне.

Пераважным правам залічэння ў аспірантуру карыстаюцца :

- асобы, якія здалі часткова ці цалкам кандыдацкія экзамены па агульнаадукацыйных дысцыплінах;
- асобы, якія маюць вопыт практычнай работы не менш за два гады па профілі, адпаведным той навуковай галіне (групе спецыяльнасцяў), па якой ажыццяўляецца залічэнне ў аспірантуру;
- асобы, якія паступаюць у аспірантуру па заяўках іншых арганізацый;
- асобы, якія з'яўляюцца лаўрэатамі Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ці іншых рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў навуковых прац;
- асобы, якія з'яўляюцца лаўрэатамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і атрымалі ўказаныя званні падчас навучання ў ВНУ.

Аспірантам, якія навучаюцца з адрывам ад вытворчасці, у вызначаным парадку выплачваецца стыпендыя.

Тэрмін навучання ў аспірантуры з адрывам ад вытворчасці – 3 гады, без адрыву ад вытворчасці – 4 гады.

Іншагародні́м прадстаўляецца інтэрнат (без сям'і).

**Дакументы падаваць па адрасе: г.Мінск, вул. Бабруйская, 9, аддзел аспірантуры БДУ, каб. 419; тэл. 209-54-23, 209-51-73.**

Гэтую інфармацыю супрацоўнікі і студэнты БДУ могуць таксама атрымаць праз любую праграму, якая працуе з электроннай поштай (напрыклад, Microsoft Outlook). Для гэтага неабходна ў меню *Від-Спіс* папак адкрыць *Агульныя папкі – Усе агульныя папкі – Галоўнае ўпраўленне навукі – Аддзел аспірантуры.*

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

30 чэрвеня 2008 года
Падпісана да друку 26.06.2008 г.
Зак. 692. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Кампутарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by